Один литовский коллега, который время от времени по служебным делам наезжает в Минск, вызвался показать нам Вильнюс. Двухчасовая прогулка убедила нас в том, что город меняется быстро, особенно его центральная часть: современные магазины, витрины, забитые многими товарами, изобилие продуктов... Наш оператор Владимир Андронов то и дело хватался за видеокамеру, чтобы запечатлеть все это богатство на пленку. Когда мы высказали свое восхищение увиденным, Андрис не без гордости произнес: "Мы еще не Америка, но уже и не Беларусь".

"Что у вас за деньги такие?"

По пути в гостиницу Андрис рассказал нам такую историю. Недавно он приезжал в Минск. Обменял, как водится в таких случаях, деньги. В магазине сувениров ему приглянулась соломенная корзиночка. Решил купить. Спросил у продавщицы цену. В ответ услышал: "Двести семьдесят четыре". Андрис выудил из кошелька три сторублевки и протянул продавщице. Та в одну секунду покрылась красными пятнами: "Вы что, надо мной издеваетесь?! Тут целый день стоишь за прилавком, и еще вы со своими глупыми шуточками".

И только тогда, когда гость объяснил, что он приезжий, продавщица немного успокоилась. Посоветовала выбросить протянутые ей бумажки, ибо за них в Беларуси сейчас даже спичек не купишь. Корзиночка же стоила, естественно, двести семьдесят четыре тысячи. "И что у вас за деньги такие?" — переспрашивал нас Андрис.

Куда исчезает туалетная бумага?

К белорусам в Литве относятся хорошо. В том смысле, что здесь нас просто жалеют, как каких-то небарак. А если кто нас и не любит, так это только проводницы. И в самом деле, за что им нас любить?

Электричку, которая идет из Вильнюса в Гудогай, литовцы пытаются худо-бедно, но хоть как-то приблизить к европейским стандартам. И посему в туалетах перед выходом поезда из депо вешают туалетную бумагу. Увы, она исчезает, едва электричка выходит из Вильнюса. Наблюдательные проводницы установили, что хищением занимаются белорусы, приезжающие в Вильнюс сбыть дешевую по местным понятиям водку. И еще. Уже зафиксировано несколько случаев, когда наши соотечественники в туалетах сливают в пустые бутылки жидкое мыло. Так могут ли за это нас любить?

Все познается в сравнении

Кто живет лучше: белорусы или литовцы? Ответить на этот вопрос нам помогла Анна Андреевна, пенсионерка, в прошлом учительница русского языка одной из вильнюсских школ. На рынке она рассказала нам о своем семейном бюджете. Ее пенсия составляет 145 долларов. Дочка, которая продолжает семейные традиции и работает учительницей на ставку, получает порядка 180 долларов. Зять — врач, который работает на полторы ставки, за что имеет 260 долларов. Внучка учится в 9 классе и ничего не получает. Итого семья из 4 человек в месяц зарабатывает 585 долларов. Содержание трехкомнатной квартиры зимой со всеми услугами составляет 85 долларов. Остается 500. Из них 250 долларов уходит на еду. "Конечно, икрой мы не питаемся, но мясо едим практически каждый день", — объясняет главная хозяйка семьи. Если из оставшейся суммы вычесть расходы на проезд, мыло, зубную пасту и прочее, то данная семья каждый месяц может отложить от 100 до 150 долларов. Вот такая здесь арифметика. Что же касается белорусской семьи, то достаточно сделать сходные расчеты. И тогда становится ясно, кто живет лучше.

Владимир ГЛОД.

Стоп-кадр

Зімовая казка.

Фота Аляксандра ІГНАЦЮКА. *г.Столін.*

Фундаментальная библиотека БГУ — депозитарная библиотека ООН

Фундаментальной библиотеке Белорусского государственного университета присвоен статус депозитарной библиотеки ООН. Она стала частью международной сети из 367 библиотек в 141 стране, которые предоставляют документы и публикации ООН пользователям во всем мире. Фундаментальная библиотека БГУ стала второй депозитарной библиотекой ООН в Беларуси. Это стало возможно в результате действующего проекта "Создание центра по изучению ООН" под эгидой ПРООН (Программа Развития ООН) в Беларуси, Управления Верховного Комиссариата по делам беженцев ООН в Беларуси и Белорусского государственного университета. Теперь у Беларуси появился еще один канал получения всесторонней информации о целях и идеалах ООН, включая вопросы международной безопасности, экономические, социальные и гуманитарные вопросы, международное право и права человека.

Соб.инф.

27—28 лютага ў Мінску пройдзе IV з'езд Аб'яднанай грамадзянскай партыі

Як стала вядома БелаПАН, 27—28 лютага ў Мінску пройдзе IV з'езд Аб'яднанай грамадзянскай партыі. У парадак дня з'езду ўключаны пытанні аб абранні старшыні партыі, ягоных намеснікаў, Нацыянальнага камітэта і Цэнтральнай кантрольна-рэвізійнай камісіі. Асобным пунктам на парадку дня стаіць пытанне пра кандыдата ў прэзідэнты Беларусі ад АГП. З'езд таксама ўнясе змяненні і дапаўненні ў праграму і статут партыі. Нагадаем, што раней IV з'езд планавалася правесці ў канцы сакавіка, аднак з-за складанай палітычнай сітуацыі ў рэспубліцы і, у прыватнасці, з-за таго, што ўжо з 1 сакавіка пачнецца рэгістрацыя кандыдатаў у прэзідэнты, было прынята рашэнне пра яго перанос на больш ранні тэрмін.

Юрый ПАЦЁМКІН.

Погляд

Дык навошта тады праводзіць перапіс?

Пачула па радыё, як слухач пацікавіўся ў выступоўцы сп.Лукашэвіч, што кіруе перапісам насельніцтва Беларусі: чаму перапісныя лісты-анкеты надрукаваны ў асноўным на адной мове — рускай? Адказ прагучаў вельмі "пераканаўча": маўляў, па-першае, у дзяржавы няма сродкаў на двухмоўнае друкаванне, а па-другое... Па сцверджанні сп.Лукашэвіч, на Беларусі 80 працэнтаў насельніцтва размаўляе па-руску і толькі 20 працэнтаў — па-беларуску. Дык, маўляў, ці варта браць пад увагу такую дробязь?

Цікава-цікава, а адкуль у выступоўцы такія лічбы? І калі яна іх ужо ведае, дык навошта пускаць на вецер дзяржаўныя сродкі (а, дакладней, нашы, падаткаплацельшчыкаў, грошы) пры правядзенні дарагога перапісу? Адразу пішыце "наверх" пераможную рэляцыю!

Па ўсім відаць, што задача перад "перапісчыкамі пастаўлена пэўная, і нават лічбавыя арыенціры ўжо ёсць. А значыць, гэта не перапіс, а фарс: што ні адказвай, "атрымаецца" тое, што трэба ўладам.

Ці не больш чэсна замест дарагой і мудрагелістай гульні, сказаць прама і пра моўны і духоўны генацыд беларускага народа на яго ж спрадвечнай зямлі? І канчаткова вы цвердзіць пра свае, загадзя "вядомыя" вам працэнты! Мо скажаце, у які слупок вы залічыце большасць тых, хто размаўляе на "трасянцы"? Да рускамоўных іх аднесяце? Дык гэта будзе абразай прыгожай і багатай рускай мове. Бо калі я, напрыклад, штодня адказваю на пытанне сустрэчных і спадарожнікаў у транспарце: "Сколькі ўрэмя", "Скока время?", "Сколько время?" і нават "Сколько времени?" — мне непрыемна гэтае няведанне мовы суседняга народа, у імя якой многія беларусы чамусьці адмаўляюцца ад сваёй, але так і не могуць прыстойна ёю авалодаць. Калі вы сапраўды ведаеце рускую мову, то абавязкова спытаеце: "Который час?". Але такіх людзей я магу пералічыць на пальцах... На думку ж сп.Лукашэвіч, іх аж 80 працэнтаў...

Не, шаноўныя! Мова народа — гэта жыццядайная крыніца духоўнасці і будучыні нашых дзяцей, а не крывое люстэрка ў руках лічыльнікаў-перапісчыкаў з раней зададзенай ідэалагічнай мэтай. Пад сваю планку хочуць яны падагнаць беларусаў. Але мова Купалы і Коласа не падганяецца ні пад якія меркі, яна настолькі магутная і квітнеючая, што вам не зацiснуць яе ніякімі хітрымі маніпуляцыямі!

Жыве Беларусь!

Ірына ШЭРШАНЬ.

Мінск.

Откровенно

Последнее "чудо" Жировичского монастыря

("Богохульные" воспоминания очевидца)

Вспоминаю, как однажды под сенью огромной старой липы во дворе Жировичской обители батюшка, сопровождая богомольцев, патетически произнес: "Сколько чудес повидало это дерево на своем веку?!".

Чудеса, как и положено, записывались в монастырскую летопись. Например, "князь Орловский, хромой от рождения, приложился к иконе Жировичской Божьей Матери и хромота исчезла". Или: "дворянка Полубинская, 15 лет не имевшая детей, приложилась к иконе Жировичской Божьей Матери и — понесла...".

Последнее чудо свершилось в 1912 году... И с тех пор ничего примечательного не происходило, если не считать мироточения одной иконы...

То ли местный люд грешил много, то ли какая иная причина, но нет в настоящее время чудес, хоть тресни!

Хотя нет. Было, было одно "чудо" — явление "батьки" народу 20 мая 1996 года. Скажем прямо, тот визит оставил у людей здешних и приезжих богомольцев неизгладимое впечатление. Даже оппозиционная пресса мало писала об этом. Видимо, и ей было неудобно описывать те подробности... А мне, как очевидцу тех событий, все же не терпится поведать миру некоторые подробности того "явления". И пусть читателя не смущает, что эта история произошла давновато, однако она была такой, что, мне кажется, имеет непреходящее значение. А сегодня, накануне президентских выборов, и тем более.

А дело было так. Чтобы избавить президента от необходимости проехаться лишних 200 метров (а может, из-за боязни, что вражеские снайперы могут притаиться на старых монастырских липах) соответствующие службы президента, чтобы обеспечить безопасность "батьки", приказали развалить десять метров старой монастырской стены и сделать "триумфальную арку" для въезда президента в лоно обители. Таким образом, глава государства смог без всяких осложнений добраться со стадиона, где приземлился его вертолет, прямо во двор монастыря. А за несколько часов до этого местные жители лицезрели, как военные саперы усердно ковыряли футбольное поле стадиона — место посадки президентского вертолета. Бедняги обливались потом: железа под дерном хватало — многие годы здесь дислоцировался артиллерийский полк, а затем — мехдвор сельскохозяйственного техникума. В конце концов саперы поняли: всех болтов и гаек из земли не извлечь, а "бомбу под "батьку" никто ставить не собирался, доложили наверх: "Проверено, мин нет!".

За полчаса до "явления "батьки" богомольному народу" вход в Успенский собор, где проходило служение, был перекрыт. Богомольцев только выпускали, никого не впускали. Видимо, по причине безопасности, а может, и еще что почудилось, местный церковный хор, состоящий преимущественно из жировичской интеллигенции, который несколько месяцев кряду репетировал встречу высокого гостя, не допустили к священнодействию. Видимо, смекнули, что вверху, где обычно располагается хор, было, по мнению охраны, очень удобное место для снайперской позиции.

Местных жителей очень удивило большое скопление войск в Жировичах и вокруг них. Один мой знакомый, живущий в конце деревни, пока шел к монастырю, насчитал 23 армейские грузовые машины с личным составом. Это только те, что стояли вдоль дороги. А сколько их было в переулках и вокруг деревни?! Никто не считал охрану в штатском: их огромное (по сельским меркам) количество особенно было заметно деревенским жителям. Наша землячка Рогнеда Пугач-Мурашкевич (Козловская), жена героя из-под Монте-Касино, специально приехавшая из США на праздник иконы Жировичской Божьей Матери, с удивлением восклицала, лицезрея "явление": "У нас так даже Клинтона не охраняют! Такой "цирк" наша пресса высмеяла бы на всю Америку!".

Больше всего от визита пострадали богомольцы, приехавшие из разных стран бывшего Советского Союза. В тот день, до самого вечера (пока "батькина" команда трапезничала и дегустировала монастырские наливки), охрана заставляла водителей автобусов рейса Слоним—Жировичи разворачиваться в полутора километрах от деревни. Им и в голову не приходило, что нужно хотя бы предупредить верующих, что собрались на автобусной остановке у монастыря, о временном введении "нового порядка". Наконец, бедные старики и старушки вынуждены были полтора километра плестись по жаре в гору со "святой водой", чтобы дойти до "новой" автобусной остановки.

Кстати, в 1994 году, как раз перед выборами первого президента, приезжал в монастырь и тогдашний премьер-министр В.Кебич. Тогда такой помпы, такой концентрации войск в Жировичах и околицах не наблюдалось. Однако ни агитация местных властей, ни славословие религиозных иерархов в его честь не принесли В.Кебичу желаемой победы. Не помогла ему и чудотворная икона. Православные жировичцы — жители деревни, учащиеся техникума, семинаристы — отдали свои голоса за... католика З.Позняка. Думаю, тут дело не в религиозной принадлежности, а в том, кто больше думает о будущем нашей Беларуси.

А.Лукашенко посетил нашу обитель уже будучи президентом. Было грустно наблюдать, как те же богослужители, что пели "асанну" В.Кебичу, превозносили до небес нового "царя".

И вот для чего я еще рассказал эту не такую уж старую историю. Грядут выборы нового президента страны. А посему хотелось бы, чтобы глава государства еще раз посетил нашу обитель. Местные жители и богомольцы уж как-нибудь перетерпят временные неудобства, связанные с "явлением" кандидата в президенты. Зато будет, наконец, ясно: влияет ли наша чудотворная икона на исход президентских выборов в Беларуси или нет? Закономерной ли была победа А.Лукашенко на прошлых выборах или это было Божье наказание всем нам за излишнюю доверчивость и слепоту?

Игорь ПОДГОРОДЕЦКИЙ, преподаватель Жировичского сельскохозяйственного техникума.

Слонимский район.

Народная Воля 18 ЛЮТАГА 1999 г.

Люстэрка

Пытанне аб стварэнні зоны свабоднага гандлю будзе адным з асноўных на пасяджэнні Савета кіраўнікоў дзяржаў СНД 26 лютага

Сталі вядомыя пытанні, якія вынесены на абмеркаванне чаргавага пасяджэння Савета кіраўнікоў дзяржаў СНД, што адбудзецца ў Маскве 26 лютага. Па інфармацыі, атрыманай у Выканаўчым сакратарыяце СНД, кіраўнікі дзяржаў Садружнасці маюць намер абмеркаваць прычыны і наступствы фінансава-эканамічнага крызісу ў сваіх краінах і шляхі іх пераадольвання. Адным з найважнейшых дакументаў, выносімых на разгляд Савета кіраўнікоў дзяржаў СНД, будзе пратакол пра ўнясенне змяненняў і дапаўненняў у Пагадненне аб стварэнні зоны свабоднага гандлю. Гэты дакумент практычна ўзгоднены, апрача пытання адносна падатку на дабаўленую вартасць.

На пасяджэнні таксама плануецца прыняць Дэкларацыю аб асноўных накірунках развіцця СНД, якая адлюстроўвае стратэгію далейшага развіцця Садружнасці. Апрача таго, запланавана абмеркаванне Праекта рашэння аб парадку старшынства ў органах СНД і пытанняў, датычных новай структуры органаў Садружнасці. Мяркуецца, што кіраўнікі дзяржаў разгледзяць і прымуць рашэнні па дакументах аб падрыхтоўцы і святкаванні 55-х угодкаў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне; аб канцэпцыі ўзаемадзеяння краін — удзельніц СНД у барацьбе са злачыннасцю; аб выкананні рашэнняў Савета кіраўнікоў краін — удзельніц СНД аб дадатковых мерах і далейшых кроках па ўрэгуляванні канфлікту ў Абхазіі; аб камандуючым Калектыўнымі міратворчымі сіламі ў Таджыкістане.

БелаПАН—УНІАН.

Дацкія "піраты" наперадзе Еўропы ўсёй

Самая буйная справа ў Еўропе па пірацкім капіраванні камп'ютэрных праграм пачалася ў Даніі. Тры дацкія фірмы капіравалі і прадавалі камп'ютэрныя праграмы па значна ніжэйшых цэнах, чым каштуюць арыгіналы. Праграмы нелегальна "вымалі" з Інтэрнэта, капіравалі і прадавалі па аб'явах. Такім чынам "піраты" нанеслі ўрон фірме, якая прадае арыгіналы праграм, на 250 мільёнаў долараў.

У сусветных маштабах пірацкае капіраванне каштуе вытворцам арыгінальных праграм больш за 10 мільярдаў долараў.

Інэса МОІН.

Суд прысяжных з Лондана прыбыў на Брэстчыну

Прадстаўнікі органаў юстыцыі Брэстчыны сустрэлі сваіх калег з Англіі, якія на трох аўтобусах прыбылі сюды з варшаўскага аэрапорта. У склад брытанскай дэлегацыі ўвайшлі 12 прысяжных засядацеляў, 8 прадстаўнікоў судзейскай брыгады і столькі ж прадстаўнікоў абароны і абвінавачання. А яшчэ ў горад над Бугам прыбылі больш як два дзесяткі журналістаў вядучых заходніх газет, інфармацыйных агенцтваў і тэлекампаній.

У Брэст прыехаў практычна ўвесь склад суда з Лондана, які цяпер вядзе судовы працэс па справе ваеннага злачынцы, былога каменданта Дамачаўскай паліцыі Антонія Саваняка (беларускае імя і прозвішча якога — Андрэй Саванюк). Гэта другі працэс па справе ваенных злачынцаў, якімі прыйшлося займацца англійскім суддзям у апошнія гады. Першы, а ў ім фігураваў таксама ўраджэнец Беларусі — з Нясвіжскага раёна, не быў завершаны, таму што абвінавачаны ў 1997 годзе памёр у Англіі.

Што ж датычыць гэтай крымінальнай справы, то прадстаўнікі брытанскай Феміды пайшлі не беспрэцэдэнтны крок, вырашыўшы паехаць у Беларусь і на месцы азнаёміцца з акалічнасцямі злачынстваў 77-гадовага Андрэя Саванюка.

Праграмай знаходжання і патрабаваннямі англійскага заканадаўства абмежаваны зносіны брытанскіх прысяжных і суддзяў з журналістамі. Таму адразу з граніцы на аўтобусах яны паехалі ў брэсцкую гасцініцу "Інтурыст", дзе, па папярэдніх умовах, суддзі, прысяжныя і абарона будуць жыць на асобных паверхах і асобна харчавацца, каб выключыць размовы іх паміж сабой.

Сярод тых, хто сустракаў англійскіх гасцей, быў і старшы памочнік пракурора Брэсцкай вобласці Генадзь Сулкоўскі, які на працягу вось ужо двух гадоў пастаянна кантактуе з імі і напярэдадні вярнуўся з Лондана. У невялікім інтэрв'ю карэспандэнту БелТА ён адзначыў, што ўсяго па гэтай крымінальнай справе праходзяць каля дваццаці сведкаў з беларускага боку. На працягу мінулага і гэтага года большасць з іх выязджалі ў Англію для дачы паказанняў сведкаў. Не раз прыязджалі на Брэстчыну і прадстаўнікі брытанскай пракуратуры, якія пацвердзілі прыметы складу злачынства. Аднак суд вырашыў на месцы праверыць абвінавачванні, што прад'яўляюцца. Ад гэтага ў многім будзе залежаць канчатковы прыгавор. Дарэчы, сам заключны працэс па гэтай крымінальнай справе пачаўся ў Лондане 8 лютага. Мяркуецца, што завершыцца ён у канцы сакавіка.

Іван КУКСА.

Лидеры 15 ведущих развивающихся стран, собравшиеся на Ямайке, осудили "потерявший стыд капитализм"

Представители так называемой "группы 15", куда на самом деле входят 17 стран Азии, Африки и Латинской Америки, единодушно предупредили, что глобализация может разрушить их экономику и так же отрицательно повлиять на весь мир.

Как заявил на церемонии открытия форума премьер-министр Малайзии Махатхир Мохамад, "как это ни парадоксально, но именно мы, которые всегда являлись последовательными антикоммунистами, переживаем после падения коммунизма настоящую катастрофу".

По его словам, в период "холодной войны" страны третьего мира "имели хотя бы возможность маневрировать, а теперь лишились и этого". В результате, отметил Махатхир Мохамад, взывать к помощи оказалось не к кому. Поэтому "обнаглевший капитализм" стал угрожать национальной независимости большинства государств планеты, так как отдает их на милость транснациональных монополий. По мнению малайзийского премьера, "столь неудержимая глобализация способна не только разрушить экономики развивающихся стран, но и больно ударить по Западу".

В подобном же духе высказалось и большинство других участников конференции. В частности, премьер-министр Ямайки Персивал Паттерсон подчеркнул, что "ритм и направление глобализации должны быть срочно модифицированы". По его словам, на Ямайке тысячи рабочих текстильной промышленности остались без работы из-за притока на традиционные рынки сбыта одежды ямайского производства аналогичных товаров из других стран с более дешевой рабочей силой.

"Группа 15" представляет треть мирового населения и 40 процентов валового национального продукта развивающегося мира. На нынешней ямайской конференции участвуют главы семи государств — Малайзии, Нигерии, Сенегала, Шри-Ланки, Венесуэлы и Зимбабве, а Алжир, Аргентина, Бразилия, Чили, Египет, Индия, Индонезия, Мексика, Кения и Перу представлены министрами или заместителями министров иностранных дел или финансов.

РИА "Новости".

У соседей



Мазурское поозерье — один из красивейших регионов Польши. Сама природа располагает здесь к чистоте помыслов и духовному совершенствованию. Может,и поэтому на этой земле в деревеньке Войново обосновался небольшой православный женский монастырь. Более ста шестидесяти лет существует эта обитель и собирает под свой кров тех, кто посвятил себя служению Господу. Живут монахини очень скромно, работают на монастырской земле, обеспечивая себя всем необходимым. Помогают словом и делом больным и немощным, а свободное от дел время проводят в молитвах. В воскресенье и праздничные дни разливается над обителью колокольный звон, собирая на святую литургию жителей Войново и окрестных деревень.

На снимке: *монастырская обитель в деревне Войново.*

Фото Евгения КОЗЮЛИ, БелТА.

Польша, Венгрия, Чехия, Словения и Эстония обратились к Европейскому Союзу с просьбой воздержаться от субсидирования экспорта в их страны

Такое обращение приняли на состоявшейся в Варшаве встрече министры финансов из этих пяти государств.

В обращении говорится, что проэкспортная политика Запада осложняет экономическое положение в странах Центральной и Восточной Европы, поскольку их собственная продукция не может конкурировать с товарами из ЕС. Одновременно министры финансов "пятерки" призвали страны ЕС к "открытию своих рынков сбыта".

ИТАР—ТАСС.

Стоп-кадр



Иордания. Город Петра. Сокровищница.

Служба военной разведки создана в Азербайджане

Указ об ее организации здесь подписал глава государства Гейдар Алиев.

Как подчеркивается в этом документе, эта служба создана в Азербайджане на основе особого управления, действовавшего при президенте с 1992 года, с целью укрепления национальной безопасности страны. Раньше вопросами военной контрразведки занималось исключительно Министерство национальной безопасности республики.

Руководителем военной контрразведки президент Азербайджана назначил Эльмана Гамбарова, являвшегося начальником особого управления, которое тем же указом главы государства упразднено.

Парада

Невядомая дагэтуль небяспека

Камісія ўпраўлення дарог у Швецыі штогод праводзіць аналіз кожнай аўтадарожнай катастрофы. На аснове такой карпатлівай работы штогод выдаюцца новыя рэкамендацыі для пасажыраў, вадзіцеляў і вытворцаў машын. Вывады камісіі друкуюцца ва ўсіх сродках масавай інфармацыі і служаць прапагандай бяспекі руху.

У гэтым годзе была абнародавана невядомая да гэтага часу небяспека пры аўтакатастрофах — пуховыя курткі, тоўстыя паліто і шубы. Рамень бяспекі, не прылягаючы да цела, не дае ніякага эфекту таму, што пры нацяжэнні адзенне прымінаецца рамянём і амплітуда ўдару становіцца такой жа, як без рамяня і з такімі ж вынікамі. Таму калі на вас шмат адзення або адзенне з тоўстага матэрыялу, рамень павінен праходзіць пад верхнім адзеннем.

Інэса МОІН.

Супрацоўніцтва

Усім цэнтрам цэнтр

Адзіны ў СНД і Усходняй Еўропе Міжнародны навукова-тэхнічны цэнтр садзейнічання ў развіцці вытворчасці і перапрацоўкі льну будзе створаны не пазней чым у 2000 годзе ў расійскім горадзе Цвер з філіялам у Мінску. Аб гэтым карэспандэнту БелТА паведамілі ў Мінсельгасхарчы рэспублікі.

У галоўным аграрным ведамстве падкрэслілі, што стварэнне цэнтра прадугледжана прынятай сумеснай беларуска-расійскай праграмай павышэння рэнтабельнасці вытворчасці і перапрацоўкі льну на аснове прагрэсіўных рэсурсазберагальных тэхналогій і тэхнікі, разлічанай на перыяд да 2000 года. Ужо цяпер самы актыўны ўдзел у стварэнні цэнтра прымаюць навукова-вытворчае аб'яднанне "Лён Беларусі", адкрытае акцыянернае таварыства "Асацыяцыя Цвярскі лён", Цэнтральны навукова-даследчы інстытут інавацыйных праблем і маркетынгу ў АПК, дзяржаўнае прадпрыемства "БелНІМСГ" і іншыя арганізацыі.

Алег ШВЕДАЎ.

Паразважаем

За 1998 год запазычанасць Беларусі перад Расійскай Федэрацыяй за энергарэсурсы павялічылася амаль на 230 мільёнаў долараў ЗША

Запазычанасць Беларусі за энергарэсурсы перад Расійскай Федэрацыяй павялічылася за 1998 год на 229,1 мільёна і склала на пачатак бягучага года 449,3 мільёна долараў ЗША. Пра гэта БелаПАН паведаміла крыніца ва ўрадзе рэспублікі.

З агульнай квоты запазычанасці доўг за газ на пачатак года склаў 383,9 мільёна долараў, за электраэнергію — 53,6 мільёна долараў, нафту і нафтапрадукты — 11,8 мільёна долараў.

Пратэрмінаваная запазычанасць за энерганосьбіты перад Расіяй на 1 студзеня 1999 года склала 401,9 мільёна долараў і павялічылася за 12 месяцаў 1998 года на 306,1 мільёна долараў.

Ягор ЗВОННІКАЎ.

Лявон БАРШЧЭЎСКІ, кандыдат філалагічных навук,
Валянцін МАЗЕЦ, кандыдат гістарычных навук

БНР пачыналася з Мінска, БССР — з Расіі

Калі на нашай вуліцы свята, альбо Развагі з нагоды двух юбілеяў

Так ужо распарадзілася гісторыя, што адзін за адным былі адзначаны юбілеі: 80 год з дня абвяшчэння БНР і 80 год — БССР. Напярэдадні прэзідэнт Беларусі А.Лукашэнка выдаў указ пра святкаванне 80-гадовага юбілею Беларускай ССР, што ўвогуле можна растлумачыць: усё ж такі стварэнне БССР было адным з этапаў усталявання беларускай дзяржаўнасці. Але ж сённяшнім уладам і іх афіцыйным гісторыкам ніколі не ўдасца як-небудзь лагічна растлумачыць, чаму яны ў такім выпадку праігнаравалі 80-годдзе Беларускай Народнай Рэспублікі і нават імкнуліся нейкім чынам зганьбіць гэтую гістарычную дату. Тым болей што А.Лукашэнка, здаецца, не раз хваліўся сваім дыпломам гісторыка. У дадзеным выпадку паводзіны ці не нагадваюць марныя намаганні вядомага персанажа рускага сатырыка Міхала Салтыкова-Шчадрына — таго самага, што ўсё хацеў... закрыць Амерыку?

Але пяройдзем ад эмоцый да фактаў, якія не здольны абвергнуць нават той, хто лічыць сябе "ўсенародна абраным".

Гісторыя нашай дзяржаўнасці пачалася, безумоўна, задоўга да 1918 года. Яе гістарычнымі этапамі былі Полацкае і іншыя беларускія княствы ў Высокім Сярэднявеччы, Вялікае княства Літоўскае ў Познім Сярэднявеччы і на пачатку Новага часу. Але незалежная дзяржава з назвай БЕЛАРУСКАЯ была ўпершыню абвешчаная менавіта ў 1918 годзе.

Сёння пэўныя сілы, грунтуючыся выключна на палітычных меркаваннях, імкнуцца прынізіць значэнне абвяшчэння незалежнай Беларускай Народнай Рэспублікі ў 1918 годзе і паказаць, што першай дзяржавай на тэрыторыі сучаснай Беларусі была БССР, якая, маўляў, "сапраўды займела ўсе найважнейшыя атрыбуты дзяржаўнасці" і з'яўлялася самастойнай і незалежнай, у той час як БНР была і "марыянеткавай", і "кайзераўскай", і "бутафорскай" і якой заўгодна.

Безумоўна, яны не могуць адмаўляць, а толькі імкнуцца замоўчваць той рэальны факт, што рашэнне аб стварэнні **Беларускай Народнай Рэспублікі прымалася прадстаўнікамі беларускіх арганізацый** у самым сэрцы беларускай тэрыторыі, у Мінску, у той час як **Сацыялістычная Савецкая Рэспубліка Беларусь** была абвешчаная на ўскрайку беларускіх этнічных зямель, **у Смаленску, дэлегатамі 6-й Паўночна-Заходняй абласной канферэнцыі РКП(б).** Гэтага, як кажуць, са скрыжаляў нашай гісторыі не сцерці, хоць мы далёкія ад таго, каб адмаўляць пэўнае гістарычнае значэнне абвяшчэння БССР 1 студзеня 1919 года, дасягнутага як саступкі бальшавікоў некаторым беларускім сілам.

Кастрычніцкі пераварот 1917 года істотна змяніў палітычную сітуацыю і ўмовы развіцця беларускага нацыянальнага руху. Ён абудзіў надзеі прадстаўнікоў гэтага руху на магчымасць справядлівага вырашэння нацыянальнага пытання. А для гэтага былі пэўныя падставы.

2 лістапада ў Пецярбурзе ўрадам Уладзіміра Леніна была абвешчаная "Дэкларацыя правоў народаў Расіі". Адзначалася, што *"Савецкі ўрад у аснову сваёй дзейнасці ў нацыянальным пытанні збіраецца пакласці прынцыпы суверэннасці і роўнасці народаў Расіі, іх права на свабоднае самавызначэнне аж да аддзялення і ўтварэння самастойных дзяржаў"*.

Абвясціўшы самавызначэнне народаў па трох прынцыпах: тэрытарыяльным, нацыянальным і працоўным, бальшавікі хутка адмовіліся ад тэрытарыяльнага і нацыянальнага прынцыпаў, бо яны мелі нашмат большую вагу ў параўнанні з трэцім, што ў сваю чаргу вяло да стварэння самастойных дзяржаў, незалежных ад Расіі. А гэта разбурала "Вялікую Расію" і было перашкодай на шляху да сусветнай сацыялістычнай рэвалюцыі, якая, на думку бальшавікоў, не павінна лічыцца з дзяржаўнымі межамі.

9 снежня 1917 года газета "Революционная ставка" ў рэдакцыйным артыкуле пісала, што "час нацыянальных дзяржаў ужо прайшоў, што мы ідзём да наднацыянальнага аб'яднання дэмакратыі".

У адпаведнасці з абвешчанымі бальшавіцкім урадам прынцыпамі, Фінляндыя і Украіна ў хуткім часе заявілі пра сваю самастойнасць, а гэта магло паслужыць прыкладам і для іншых народаў.

Але, абвясціўшы агульны прынцып нацыянальнай палітыкі — права нацый на самавызначэнне, — бальшавікі на Беларусі ў 1917 годзе яшчэ не вызначылі канкрэтнай пазіцыі адносна вырашэння нацыянальнага пытання ў краі.

Вырашыць гэтае пытанне (аб дзяржаўнасці Беларусі) імкнуліся прадстаўнікі беларускіх арганізацый, якія былі на момант Кастрычніцкага перавароту аб'яднаныя ў некалькіх цэнтрах. Адным з такіх цэнтраў на неакупаванай немцамі тэрыторыі быў Мінск.

27 кастрычніка 1917 года Вялікая Беларуская Рада, Выканаўчы Камітэт Заходняга фронту, Беларуская Сацыялістычная грамада і Беларуская народная партыя сацыялістаў выдаюць "Грамату да беларускага народу": "У гэтыя дні належыць паказаць сапраўды, што змучаная пакутай беларуская рэвалюцыйная дэмакратыя не дапусціць, каб віхор бязладу згубіў нашу святую нацыянальную справу абароны вольнасцей і правоў Беларускага народа" (Запіскі аддзелу гуманітарных навук. Працы кафедры сучаснага права. Менск, 1929. Т.1. С. 18).

Другім значным цэнтрам дзейнасці беларускіх арганізацый была сталіца Расіі Петраград. Беларусы, асабліва тыя, хто па розных прычынах апынуліся па-за межамі краю, усё часцей выказваліся за абвяшчэнне Расіі федэратыўнай рэспублікай, выяўляючы жаданне мець свае арганізацыі, а таксама перыядычны друк і школы на роднай мове. Прадстаўнікі ад беларускіх губерній на Усерасійскіх сялянскіх з'ездах спачатку не мелі пэўна афармленай арганізацыі паводле нацыянальна-тэрытарыяльнай адзнакі даволі працяглы час. З ліку тых прадстаўнікоў і ўтварыўся Беларускі Абласны Камітэт.

Членамі Камітэту былі дэлегаты беларускіх губерній на Усерасійскіх з'ездах сялянскіх дэпутатаў, прадстаўнікі вайсковых камітэтаў франтоў і флоту, губернскіх і іншых Саветаў. Усяго Камітэт складаўся з 70 чалавек, якія падпісалі 17 лістапада 1917 года дэкларацыю, дзе звярталіся да беларускага сялянства, земстваў, думаў ды кааператываў, воінаў-беларусаў, інтэлігенцыі, Саветаў сялянскіх дэпутатаў неадкладна паставіць пытанне аб самавызначэнні беларускага народа з мэтай утварэння "аўтаномна-свабоднай Беларусі як часткі Расійскай Федэратыўнай Рэспублікі" (Ялугін Э. Без эпітафіі. Мн., 1989. С. 91).

Пад кіраўніцтвам бальшавікоў адбываецца працэс аб'яднання Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў. Вядомы дзеяч бальшавіцкай партыі Вільгельм Кнорын успамінаў:

"На аснове таго, што кіруючая група работнікаў нашай партыі ў гэты самы час складалася пераважна з таварышаў, якія прыехалі ў Беларусь з Ленінграду, Масквы, Рыгі, Іванава-Вазнясенска, некаторыя да гэтага часу кажуць, што Кастрычніцкая рэвалюцыя ў Беларусі была праведзена рускімі бальшавікамі і пасля Кастрычніцкая ўлада была прыезджай, чужой, рускай" (Кнорин В. Заметки к истории диктатуры пролетариата в Белоруссии. Мн., 1934. С. 10).

Сапраўды, сфарміраваныя пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі ВРК, Аблвыкамзах, Саўнаркам Заходняй вобласці і фронту займаліся галоўным чынам справамі фронту, фарміраванне Заходняй вобласці не было завершанае. (Игнатенко И.М. Октябрьская революция и самоопределение Белоруссии. Мн., 1992. С. 87). У адпаведнасці з гэтым прадстаўнікі беларускіх нацыянальных арганізацый лічылі гэтую ўладу часовай, франтавой. 18 лістапада 1917 года Выканаўчы Камітэт Вялікай Беларускай Рады выпусціў адозву за №683, дзе прызначаў на 5 снежня 1917 года адкрыццё Усебеларускага з'езду ў Мінску. Для ўдзелу ў працы з'езду Выканкам запрашаў дэлегаваць па адным прадстаўніку ад кожнай беларускай арганізацыі (Аддзел рукапісаў бібліятэкі АН Літвы, ф. 21, спр. 2224, арк. 1). 8 снежня 1917 года газета "Вольная Беларусь" паведаміла, што *"на з'ездзе будзе ісці гаворка пра абвяшчэнне Беларускай дэмакратычнай рэспублікі ў складзе Віленшчыны, Міншчыны, Магілёўшчыны, Віцебшчыны, Гродзеншчыны, паўночнай часткі Чарнігаўшчыны, заходніх паветаў Смаленшчыны"*. На з'езд выбіраліся прадстаўнікі ад воінаў-беларусаў, бежанскіх арганізацый, валасных і павятовых земстваў, гарадскіх дум, настаўніцкіх камітэтаў, мясцовых Саветаў сялянскіх, рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Аблвыканзах, дарэчы, **не пратэставаў супраць нормаў прадстаўніцтва, прапанаваных Вялікай Беларускай Радай.** Беларускі Абласны Камітэт імкнуўся перахапіць ініцыятыву па скліканні з'езду ў свае рукі і звярнуўся да СНК Расійскай Рэспублікі ў Петраградзе па палітычную, а таксама і па матэрыяльную падтрымку. Гэта было абумоўлена тым, што без дазволу петраградскіх уладаў з'езд у тых канкрэтных умовах правесці было амаль не магчыма. У пачатку снежня 1917 года Беларускі Абласны Камітэт звярнуўся ў Наркамнац з прапановай аб сумеснай рабоце па ўмацаванні Савецкай улады ў Беларусі. 2 снежня 1917 года СНК пад старшынствам У.Ульянава-Леніна прыняў рашэнне аб фінансавай дапамозе БАКу. 6 снежня 1917 года ў газеце "Известия" былі надрукаваныя "Умовы сумеснай працы" БАКа з Наркамнацам дзеля ўпарадкавання пытання аб "безоговорочном и полном самоопределении белорусского народа". Тут падкрэслівалася, што выбранаму на з'ездзе Савету сялянскіх, салдацкіх і рабочых дэпутатаў і павінна была потым належаць краёвая ўлада. Дзякуючы намаганням прадстаўнікоў Вялікай Беларускай Рады Язэпа Варонкі і Язэпа Мамонькі, удалося дасягнуць згоды з Беларускім Абласным Камітэтам аб сумесным правядзенні Усебеларскага з'езду. Кіраўнікі беларускага нацыянальна-вызваленчага руху, пры наяўнасці розных поглядаў, ставілі перад сабою задачу выявіць волю народа, як галоўнага гаспадара краіны. Гэтую волю павінен быў увасобіць у заканадаўчыя акты Усебеларускі з'езд. Звязана гэта было з тым, што сістэма прадстаўніцтва на з'ездзе была задуманая і ажыццёўленая даволі шырока. На Усебеларускі з'езд сабралася 1872 дэлегаты. Урад Савецкай Расіі, які на прыкладзе Фінляндыі, Украіны і польскіх легіёнаў пераканаўся ў тым, якую магутную сілу маюць нацыянальныя рухі, шукаў магчымасці выкарыстаць беларускі нацыянальны рух у сваіх мэтах. Пра гэта сведчыць той факт, што Наркамнац згадзіўся з тым, што з'езд на пэўных умовах можа адбыцца, каб на аснове самавызначэння народаў выявіць волю беларускага народа. (АР БАН Літвы, ф. 21, спр. 2283, арк. 88). Арганізатары з'езду імкнуліся ўстанавіць кантакт з СНК Заходняй вобласці, але ўсе прапановы "дасягнуць узаемаразумення і ўстанавіць модус узаемных адносін дзеля ўмацавання заваёў рэвалюцыі" кіраўнікамі СНК былі адхіленыя (НА РБ, ф. 458, спр. 22, арк. 3). Пры ўсім гэтым Аблвыкамзах у Мінску быў нават супраць дапушчэння склікаць Усебеларускі з'езд. Аб гэтым сведчыць наступнае. 5 снежня 1917 года з Рагачова ў Мінск на імя К.Ландэра прыйшла ваенная дэпеша: "Минск. Совдеп. Ляндэру".

"Здесь члены старого крстьянсовета задались целью самоопределить Белоруссию, организовать белорусские полки, разогнать минских большевиков, объявить власть рады. (На) крестьянском съезде мне удалось организовать всех фронтовиков, поэтому получился перевес (в) нашу сторону. Нашими стараниями отклонена просьба белорусов получить разрешение организовать войска. **Примите и вы все меры парализовать созыв съезда.** *Рогачёв. 5 декабря, №5150. Азаров"* (Беларускі шлях, 1918, 23 красавіка — выдзяленне зроблена намі — Аўт.).

Вось так у сапраўднасці бальшавікі на Беларусі ставіліся да беларускай нацыі і дзяржаўнасці.

Тым не менш з'езд адбыўся, і прадстаўнікі Аблвыкамзаху прысутнічалі на ім. Пра гэта піша ў сваіх успамінах Макар Краўцоў (Касцевіч): "...*віталі з'езд і два народныя камісары "Западной области и фронта": Бэрсан (нацыянальных спраў) и Рэзавускі (унутраных спраў). Першы з іх выступаў ад ППС — лявіцы; другі— ад імя партыі бальшавікоў. Прамова Бэрсана была выслуханая З'ездам спакойна, Рэзавускаму да канца дагаварыць не ўдалося, але ў часе прамовы ён узяўся за ражок нацыянальнага беларускага штандару, што вісеў над аратарскай трыбунай (на сцэне Гарадскога тэатру) назваў гэты штандар "национальной тряпкой" і заклікаў замяніць яе "красным знаменем интернационала", дык на сцэну выйшлі два матросы, узялі фігуру наркома Рэзавускага пад рукі і вывелі вон"* (Шлях моладзі, 1938, № 6. С. 135). Гэты эпізод не спыніў работы з'езду.

Што праўда, была прапанова адкласці пачатак з'езду, на якую Язэп Мамонька адказаў: "Тыя, хто хоча адкласці з'езд, мабыць, не ведаюць, як цяжка склікаць з'езд: ад імя XII арміі кажу я вам **мы можам аб'явіць у краіне ўладу.** Калі ў Петраградзе, што бальшавікі без з'езду аб'явілі ўладу, то чаму мы не можам аб'явіць уладу на з'ездзе?" (Беларуская рада, 1917. №6).

І 7 снежня 1917 года І Усебеларускі з'езд усё-такі пачаў сваю працу ў Мінскім гарадскім тэатры. Як сведчыць у сваіх успамінах Кастусь Езавітаў, "сцэна была ўпрыгожана нацыянальнымі сцягамі і гербам Пагоні. Зала, ложы, усе балконы, ложа аркестру і нават частка праходаў былі заняты дэлегатамі. Цывільныя вопраткі нашае інтэлігенцыі, мундзіры афіцэраў, світкі сялянаў, курткі работнікаў і гімнасцёркі стральцоў рэпрэзентавалі ўсе станы беларускага народа" (Цыт. па: Згода, 1992. № 1).

На з'ездзе абмяркоўваліся пытанні вайны і міру, унутранага эканамічнага і палітычнага становішча Беларусі, стварэння органу Краёвай улады. Калі падрыхтоўчая работа была завершаная, з'езд перайшоў да прыняцця рашэнняў па асноўных пытаннях з'езду. Вось як раз пра гэта пісаў у сваіх успамінах Макар Краўцоў: *"Надыходзіў фатальны момант — ноч з 30-га на 31-га снежня (новы стыль). Справа будучыні Беларусі абгаворана была ў "зямлячаствах" і ў кожным з іх апрацаваны былі дэкларацыі. Зарысаваліся два кірункі: смаленцы, мянчукі, віленцы й горадзенцы выказваліся за як найбольшую самастойнасць Беларусі, а віцябляне й магілёўцы не маглі развітацца і з сваім усерасійскім патрыятызмам, снуючы думкі аб Расеі дэмакратычнай"* (Шлях моладзі, 1938. №6. С. 150).

Дзякуючы намаганням Аляксандра Цвікевіча, было выпрацавана кампраміснае рашэнне. Але Усебеларускі з'езд завяршыць сваю работу не змог.

Згодна з пратаколам з'езду, калі на пленарным пасяджэнні З'езду ў ноч з 17 на 18 снежня пачалося абвяшчэнне рэзалюцыі па пытанні аб сучасным становішчы Беларусі і формах арганізацыі краёвай улады, у залу пасяджэнняў з'явіліся прадстаўнікі СНК Заходняй вобласці — нарком унутраных спраў Рэзавускі і начальнік мінскага гарнізону Крывашэін.

У гэты час дэлегатамі з'езду па разгледжанай раней рэзалюцыі была прынятая наступная пастанова:

"Усебеларускі з'езд, які сабраўся ў Менску Беларускім, абмеркаваўшы цяжкое становішча краіны і Беларусі, замацоўваючы сваё права на самавызначэнне, заваяванае Расійскай рэвалюцыяй, і пацвярджаючы дэмакратычны рэспубліканскі лад у межах Беларускай зямлі дзеля захавання цэласнасці Беларусі ў складзе Расійскай федэратыўнай дэмакратычнай рэспубліцы, пастанавіў вылучыць са свайго складу **орган краёвай улады ў асобе Усебеларускага Савета Сялянскіх, Салдацкіх і Рабочых Дэпутатаў, якому ўручыць кіраванне Беларуссю аж да склікання Беларускага Устаноўчага Сходу"** (Речь А. Т. Вазилло, произнесённая на 1-м Всебелорусском сьезде. Предисловие Е. С. Канчера. Петроград, 1918. С. 2). Як сведчыць Яўсей Канчар, калі прымалася гэтая пастанова, **"...съезд был единодушен, как никогда".**

Пасля першага разгледжанага пытання дэлегаты збіраліся разгледзець і астатнія пункты выпрацаваных рэзалюцый. Але ў гэты момант на настойлівыя патрабаванні Крывашэіна яму было *"дадзена слова для нечарговай заявы. Устанавіць змест заявы т. Крывашэіна Прэзідыум з'езду не змог з-за таго, што Крывашэін быў відавочна ў нецвярозым стане"*, адзначана ў Пратаколе Усебеларускага з'езду (АР БАН Літвы, ф. 21, спр. 871, арк. 7).

Неўзабаве ў залу пасяджэнняў былі ўведзены ўзброеныя салдаты рэвалюцыйнага палка пад кіраўніцтвам Рамнёва. З'езд быў разагнаны збройнай сілай. Былі арыштаваныя Прэзідыум з'езду і многія з яго ўдзельнікаў: Янка Серада, А. Вазіла, Тамаш Грыб, Язэп Варонка, Язэп Мамонька, Ігнат Дварчанін, Алесь Бурбіс і іншыя — усяго 25 чалавек. У адказ на дзеянні бальшавікоў на з'ездзе была прынята наступная рэзалюцыя:

"1. Давясці да ведама ўсіх грамадзян Расіі. цэнтральнага ўраду, усіх рэспублік Расійскай федэрацыі аб грубым насіллі над свабодным Беларускім народам, які заваяваў і мае роўнае з другімі права на самавызначэнне.

2. Не прызнаваць улады насільнікаў і заклікаць увесь Беларускі народ выступіць на шлях адкрытай і рашаючай барацьбы з прадстаўнікамі гэтай улады ў Мінску" (АР БАН Літвы, ф. 21, спр. 871, арк. 8). Разгон з'езду з'явіўся наглядным урокам палітграматы для беларускіх патрыётаў.

(Працяг на 4-й стар.)

БНР пачыналася з Мінска, БССР — з Расіі

Калі на нашай вуліцы свята, альбо Развагі з нагоды двух юбілеяў

(Працяг. Пачатак на 3-й стар.)

Усебеларускі з'езд аказаў уплыў на ўсё далейшае развіццё беларускага нацыянальна-вызваленчага руху, прымусіўшы лічыцца з абуджэннем нацыянальнай свядомасці беларускага народа нават і тых, хто ўсімі сіламі спрабаваў з ёю змагацца як з перашкодай на шляху да сусветнай пралетарскай рэвалюцыі. Разгон з'езду ўжо не мог спыніць далейшага развіцця беларускага руху.

18 снежня 1917 года дэлегаты з'езду сабраліся на нелегальнае пасяджэнне ў клубе чыгуначнікаў. Першым чынам быў афармлены пратэст супраць бальшавіцкага гвалту над прадстаўнікамі беларускага народа. Дарэчы, дзесяткі рэзалюцый з пратэстамі з той самай нагоды былі прынятыя ў той час абсалютна рознымі арганізацыямі — ад з'езду настаўнікаў Мінскага павету да вайсковых камітэтаў Заходняга фронту. Потым з'езд прыняў шэраг пастаноў аб арганізацыі ўлады на Беларусі:

"1) Лічыць I Усебеларускі з'езд разагнаным сілаю.

2) Савет з'езду прызнаць выканаўчым органам з'езду, у абавязак якога ўваходзіць ажыццяўленне ўсіх рашэнняў і пастаноў з'езду.

3) Папоўніць Савет з'езду дэлегатамі зямляцтваў і іншых груп, дазволіць права адводу і кааптацыі — і г.д." (Канчер Е. Белорусский вопрос. Сборник статей. Петроград, 1919. С. 52).

Згодна з пратаколам пасяджэння, у гэты ж дзень, 18 снежня (31 снежня) 1917 года было прынята наступнае рашэнне:

"1. Совет съезда объявить Временной Краёвой властью.

2. Принять резолюцию, выработанную Советом съезда в ночь с 17 на 18 декабря 1917 года... (НА РБ, ф. 62, воп. 1, спр. 3, арк. 21).

21 снежня Савет Усебеларускага з'езду прыняў рашэнне, адным з пунктаў якога было:

"Немедленно выделить из своего состава "Исполнительный комитет Совета Первого Всебелорусского съезда", о чем и довести до сведения центрального правительства России... и граждан Белоруссии" (НА РБ, ф. 62, воп. 1, спр. 3, арк. 22).

Выканаўчаму камітэту, які быў абраны ў складзе 17 чалавек, даручалася тэрмінова заняцца **беларусізацыяй саветаў на месцах.**

Мы падрабязна спыніліся тут на выніках працы першага Усебеларускага з'езду дзеля таго, каб засведчыць, што гэты з'езд, па-першае, **меў найвышэйшую ва ўмовах таго часу ступень легітымнасці і што законна створаныя ім пасля гвалтоўнага разгону з'езду органы мелі права пашырацца і прымаць абсалютна легітымныя рашэнні па пытаннях, што датычыліся лёсу Беларусі і яе народа.**

Гвалтоўны разгон з'езду бальшавікамі прывёў да канфрантацыі паміж імі і прадстаўнікамі беларускіх нацыянальных арганізацый, у выніку якой беларускія арганізацыі вымушаны працягваць сваю работу нелегальна. Так, Выканаўчы Камітэт Рады Усебеларускага з'езду вырашыў накіраваць сваю дэлегацыю на мірныя перамовы ў Брэст, але ні бальшавіцкай Маскве, ні кайзераўскаму Берліну такая ініцыятыва не магла прыйсціся даспадобы.

Так, кіраўнік савецкай дэлегацыі Л.Троцкі адкрыта заявіў, што "не можа дапусціць, каб на мірных перагаворах Беларусь прадстаўляў нехта іншы, апрача яго" (Краўцоў М . Рада Беларускай Народнай Рэспублікі. Вільня, 1921. С.11).

Як вядома, брэсцкія перамовы напачатку не прывялі ні да якога выніку. І, не маючы магчымасці стрымаць наступ нямецкіх войскаў, СНК Заходняй вобласці і фронту прыняў рашэнне аб сваёй эвакуацыі з Мінска.

Позна вечарам 19 лютага Выканаўчы Камітэт з'езду скончыў сваё апошняе нелегальнае пасяджэнне, апрацаваўшы Першую Устаўную Грамату да народаў Беларусі. Крыху раней адбылося надзвычайнае пасяджэнне Выканкама БЦВР, на якім было прынята рашэнне: *"Ввиду явно определившегося стремления Народного Комиссариата Западной области сбежать на восток и ввиду приближения немцев и возможности анархии в городе — взять на себя охрану порядка и безопасности в Минске, а если понадобится, то и во всей Белоруссии, а также предложить Исполкому Рады I Всебелорусского съезда исполнить волю съезда и взять власть в свои руки"* (Варта, 1918. №1. С. 36).

Камендантам горада быў назначаны Канстанцін Езавітаў, які ўцёк з-пад бальшавіцкага арышту. Абапіраючыся на некаторыя вайсковыя групы, на прафесійныя хаўрусы чыгуначнікаў, тэлеграфістаў і іншых, Выканаўчы Камітэт БЦВР бярэ на сябе ахову парадку ў Мінску.

І вось 20 лютага 1918 г. Выканаўчы Камітэт Рады I Усебеларускага з'езду выдаў Першую Устаўную Грамату, у якой адзначалася:

"Выканаўчы Камітэт Рады Першага Усебеларускага з'езду, *папоўнены прадстаўнікамі рэвалюцыйнай дэмакратыі нацыянальных меншасцяў, здзяйсняючы мэты з'езду,* **абвяшчае сябе часовай уладай на Беларусі** *для кіравання краем і склікання, як можна хутчэй, Усебеларускага Устаноўчага Сойму на аснове агульнага права для ўсякага дарослага, не лічачыся з нацыянальнасцю, вызнаннем і родам.*

Часовую народную ўладу краю, *якая ставіць сабе мэтаю абарону і зацверджанне заваяванняў рэвалюцыі,* **будзе здзяйсняць створаны намі Народны Сакратарыят Беларусі,** *які ад гэтага дня пачаў выконваць свае абавязкі".*

Народнымі сакратарамі сталі: замежных спраў і старшынёй Народнага Сакратарыята — Язэп Варонка, унутраных спраў — Іван Макрэеў, народнай асветы — Аркадзь Смоліч, юстыцыі — Е.Бялевіч, народнай гаспадаркі — Іван Серада, шляхоў зносін — В.Рэдзька, грашовых спраў — Г.Белкінд, забеспячэння (сацыяльнай апекі) — П.Бадунова, велікарускіх спраў — І.Злобін, кантролю — Пётр Крэчэўскі, поштаў і тэлеграфаў — А.Карач, кіраўніком спраў — Лявон Заяц, спецыяльна ўпаўнаважаным па вайсковых справах — Кастусь Езавітаў. Старшыня Народнага Сакратарыята Язэп Варонка 22 лютага, у дзень уваходу немцаў у Мінск, паспеў распарадзіцца, каб спіс членаў Народнага Сакратарыята на нямецкай мове быў расклееены на вуліцах Мінска.

25 лютага 1918 года нямецкі камендант прымусова выселіў Народны Сакратарыят з яго Дому. Быў зняты беларускі сцяг, а К.Езавітаў атрымаў загад аб расфарміраванні 1-га Беларускага палка, што было адразу выканана. Усе далейшыя спробы Народнага Сакратарыяту стварыць узброеныя сілы не мелі поспеху, таму што нямецкія ўлады рабілі гэтаму ўсемагчымыя перашкоды.

Урад быў створаны, але Беларусь яшчэ не была аб'яўлена рэспублікай. Менавіта гэты момант і не даў магчымасці прадстаўнікам беларускай дэлегацыі С.Рак-Міхайлоўскаму і А.Цвікевічу бараніць інтарэсы Беларусі на мірных перагаворах у Брэсце.

Ганебны Брэсцкі мір быў заключаны. Усе вялікія дзяржавы гэтага свету адмовіліся прызнаваць беларускую нацыю, беларускі народ як суб'ект палітыкі. Як адзначаў Макар Краўцоў, *"Беларусь была парэзана на кавалкі, без ніякае згоды на гэта з яе боку, без ніякага яе голасу пры гэтым".*

У гэтай сітуацыі Выканаўчы Камітэт **9 сакавіка 1918 года** Рады Першага Усебеларускага з'езду абнародуе Другую Устаўную Грамату, у якой **Беларусь абвяшчаецца Народнай Рэспублікай у межах "рассялення і лічэбнай перавагі беларускага народу".**

У Беларусі абвяшчаліся свабоды: слова, друку, сходаў, забастовак, хаўрусаў, безумоўная вольнасць сумлення, недатыкальнасць асобы і памяшкання (жылля), права народаў на нацыянальна-персанальную аўтаномію, раўнапраўе ўсіх моў народаў Беларусі. Абвяшчалася адмена існуючай тады прыватнай уласнасці на зямлю, якая перадавалася без выкупу тым, хто яе апрацоўваў. Лясы, воды і нетры зямлі абвяшчаліся ўласнасцю БНР. У межах Беларускай Народнай Рэспублікі ўстанаўліваўся 8-гадзінны рабочы дзень.

Абвяшчаючы правы і вольнасці грамадзян і народаў Беларускай Народнай Рэспублікі, Выканаўчы Камітэт Рады з'езду, зразумела, абавязаўся "пільнаваць законнага парадку ў Рэспубліцы і захаваць правы і вольнасці працоўнага люду".

Такім чынам, **Другая Устаўная Грамата ўстанавіла галоўныя пункты Канстытуцыі БНР,** хоць яшчэ нічога не сказала аб яе суверэннасці, тэрыторыі і адносінах да суседніх рэспублік.

19 сакавіка адбылося ўрачыстае пасяджэнне Рады Усебеларускага з'езду, якая папоўнілася прадстаўнікамі гарадоў, земстваў і нацыянальных меншасцяў. На гэтым пасяджэнні былі:

1) выбраны прэзідыум Рады ў складзе старшыні Янкі Серады, намесніка Язэпа Варонкі, сакратароў Кастуся Езавітава і Тамаша Грыба; 2) зацверджаны наказ прадстаўніцтва ў Раду; 3) Выканаўчы Камітэт Савету з'езду перайменаваны ў Раду БНР.

Немцы хоць і не ліквідавалі сілаю працы Народнага Сакратарыяту, але фактычна паралізавалі яго працу, найперш у правінцыі. У той жа час Народны Сакратарыят збіраўся на пасяджэнні без афіцыйнага ведама немцаў, пры тым, што ўсякія публічныя сходы без іх дазволу былі строга забароненыя.

Умовы і гандаль беларускім народам і тэрыторыяй паміж бальшавікамі і немцамі **патрабавалі выяўлення юрыдычнага аблічча ад Беларусі.** Нельга было пратэставаць супраць падзелу, калі дзялілі тыя, каму яшчэ належаў суверэнітэт над Беларуссю і для каго гэты раздзел быў толькі ўнутранай справай Расіі.

Ідэя абвяшчэння незалежнасці Беларускай Народнай Рэспублікі была падтрымана Віленскай Беларускай Радай, створанай 25—27 студзеня 1918 года. З вялікімі цяжкасцямі ёй удалося накіраваць дэлегацыю ў Мінск. Сярод віленцаў, што прыбылі ў Мінск, былі Іван і Антон Луцкевічы, Янка Станкевіч і Язэп Туркевіч.

У выніку на пасяджэнні Народнага Сакратарыяту **25 сакавіка,** з узыходам сонца, большасцю галасоў, пасля доўгае барацьбы прыхільнікаў незалежнасці — грамадаўцаў — з расійска-польскай групай земцаў, **была абвешчана незалежнасць Беларусі,** аб чым і была выдадзена, адпаведна, Трэцяя Устаўная Грамата:

"Ад гэтага часу Беларуская Народная Рэспубліка абвяшчаецца незалежнаю і вольнаю дзяржавай. Народы Беларусі ў асобе Устаноўчага Сойму пастановяць аб будучых дзяржаўных сувязях Беларусі".

Абвяшчэнне Беларусі незалежнаю рэспублікай ва ўмовах нямецкай акупацыі з'явілася крокам, які быў зроблены насуперак жаданню суседзяў, унутраных ворагаў і нямецкіх акупантаў. Сапраўды, яе з'яўлення не жадалі ні Расія, ні Германія, ні Польшча, ні краіны Антанты, ні нават Літва, якая прэтэндавала на частку беларускіх земляў.

Любая дзяржава, як вядома, як сведчанне свайго суверэнітэту, павінна мець сімвалы: **сцяг, герб, дзяржаўную пячатку.** Ужо ў дні стварэння Народнага Сакратарыяту 19—21 лютага 1918 года перад домам Беларускай Рады развяваўся беларускі нацыянальны сцяг — бел-чырвона-белы. 28 красавіка 1918 года на пасяджэнні Народнага Сакратарыяту была зацверджана дзяржаўная пячатка БНР: "Пагоня" з кругавым надпісам "БНР" (Гоман. 1918. 7 мая).

Істотную падтрымку атрымалі Народны Сакратарыят і Рада БНР на месцах. Адразу пасля ўтварэння Народнага Сакратарыяту, 25 лютага 1918 года газета "Минские новости" паведамляла: *"На имя Белорусского Народного Секретариата беспрерывно поступают заявления разных групп и обществ о признании власти избранного Секретариата Белоруссии".* У гарадах, мястэчках па ініцыятыве беларускай мясцовай інтэлігенцыі і духавенства ўзнікалі гарадскія і павятовыя беларускія рады.

Да прыкладу, 31 сакавіка 1918 года адбылося надзвычайнае пасяджэнне Магілёўскай краёвай Рады, на якім было прынята наступнае рашэнне:

"1) прызнаць уладу Цэнтральнай краёвай Беларускай Рады;

2) павінна быць створана адзіная непадзельная Беларусь у форме БНР;

3) дэлегаваць у Мінск свайго прадстаўніка" (Могилёвский голос, 1918. 2 апреля).

Аналагічныя пастановы прыходзілі з іншых гарадоў і павятовых цэнтраў Беларусі (Бабруйск, Радашковічы, Барысаў, Слуцк, Нясвіж, Навагрудак, Койданава, Рэчыца і інш.). Так, газета "Гоман" 12 красавіка 1918 года паведамляла: "З Менска паказваюць, што весці аб прызнанні Народнага Сакратарыяту прыходзяць амаль штогадзіну".

Шматлікія дэлегацыі кожны дзень прыбывалі ў Мінск дзеля наладжвання супрацоўніцтва з Народным сакратарыятам БНР. 24 красавіка 1918 года на пасяджэнні Народнага Сакратарыяту было прынята рашэнне склікаць Беларускі Устаноўчы Сход 1 снежня 1918 года (НА РБ, ф. 62, воп. 1, спр. 195, арк. 1). Такое рашэнне з радасцю вітаў Янка Купала, які ад самага пачатку стаў на пазіцыі БНР:

Час склікаці ўжо грамаду
На вялікую нараду,
На вялікі сход!
Хай рассудзіць, хай развəжыць,
Слова цьвёрдае хай скажаць,
Скажаць сам народ!..

Хай званы зазвоняць з жарам,
Хай музыка ў струны ўдара!
Гэй, паўстань, народ!
За сябе сам пастаяці
І за Бацькаўшчыну-маці
Йдзі, народ, на сход!

У гэты самы час пачаліся і актыўныя дыпламатычныя перамовы паміж прадстаўнікамі ўраду БНР і УНР. Яшчэ 25 сакавіка 1918 года ўрадам БНР была створана і накіравана ў Кіеў спецыяльная дэлегацыя (дыпламатычная місія) на чале з Аляксандрам Цвікевічам для вядзення перагавораў з зацікаўленымі бакамі аб пераглядзе ўмоў Брэсцкага мірнага дагавора і аб прызнанні незалежнасці БНР. Яны прывезлі весткі, што *"Украінскі Урад фактычна прызнаў незалежнасць Беларусі, аб чым ён гэтымі днямі і разашле апавяшчэнне ўсім дзяржавам".* З 16 чэрвеня 1918 года Павел Трэмповіч узначаліў Беларускае Консульства ў Кіеве.

Для таго, каб садзейнічаць стварэнню беларускіх мясцовых рад і рэгуляваць іх дзейнасць, 20 красавіка 1918 года Народны Сакратарыят за подпісамі Я.Варонкі і А.Аўсяніка выдаў "Часовы наказ мясцовым Беларускім Радам". Адзначалася, што "Беларускія Рады маюць мэтаю дзяржаўную незалежнасць Беларусі, развіццё і паўсюднае расшырэнне беларускай культуры".

У паведамленні ад 6 чэрвеня 1918 года "Сфера ўплыву Народнага Сакратарыяту" адзначалася: "За апошні тыдзень Народны Сакратарыят наведалі прадстаўнікі Магілёўскай, Віцебскай губерній, Гомельшчыны, Палесся, Вілейскага павету і іншых гарадоў. **З усіх месцаў дэлегаты прывозяць пастановы аб прызнанні ўлады Народнага Сакратарыяту і просьбу рэгуляваць жыццё"** (НА РБ, ф. 62, воп. 1, спр. 191, арк. 72).

З чэрвеня 1918 года А.Квасніцкі быў прызначаны ўкраінскім консулам ў Мінску. **Украіна афіцыйна прызнала БНР.**

Важнай сферай дзейнасці Народнага Сакратарыяту былі гаспадарчыя пытанні. Адно з такіх пытанняў — фінансы. Ужо ў красавіку 1918 года на разгляд Рады БНР Я.Варонка і Народны Сакратар Фінансаў П.Крэчэўскі паставілі пытанне аб выпуску беларускіх крэдытных білетаў... Пётр Крэчэўскі, Народны Сакратар Фінансаў БНР, у маі 1918 года склаў праграму развіцця фінансаў і гандлю. Згодна з праграмай прадугледжваліся наступныя мерапрыемствы: "1) знешнія займы, як асновы прызнання Рэспублікі і моцнага становішча ўласнай валюты; 2) выпуск уласных грошаў, якія забяспечваюцца коштам таварнага лесу; 3) падатковыя мерапрыемствы:

а) да поўнага фарміравання апарату ўлады і правядзення ў жыццё сістэмы зыску ўсіх ставак збораў па закону прагрэсіўнага падушнага падатку ўстанавіць аднаразовы збор; 4) манаполія на прадукцыю заводаў па выпуску спірту з абмежаваннем продажу напіткаў у краіне згодна з фінляндскай сістэмай; 5) запалкавая манаполія; 6) выпуск латарэйных білетаў на ўзор Варшаўскай латарэі; 7) манаполія на продаж картаў для гульні; 8) пры заключэнні гандлёвых пагадненняў дамагацца зніжэння да мінімуму пошліны на прадметы нашага вывазу; 9) свабодны экспарт жывёлы і птушак" (НА РБ, ф. 62, воп.1, спр. 191, арк. 120).

Праграма гэтая пры больш спрыяльных варунках, безумоўна, садзейнічала б эканамічнаму адраджэнню Беларусі.

Для агульнага кіраўніцтва гандлем БНР 25 красавіка 1918 года была створана Беларуская гандлёвая палата. Асабліва паспяхова гандаль развіваўся з Украінай.

Вакол рады БНР была згуртаваная беларуская дэмакратычная інтэлігенцыя, якая разумела сацыяльны прагрэс толькі ў сувязі з нацыянальна-дзяржаўным самавызначэннем і стварэннем незалежнай нацыянальнай дзяржавы. Яна клапацілася і пра свае будучыя кадры.

З ініцыятывы Язэпа Варонкі у Менску планавалася адчыніць асобную школу: Беларуская Грамадска-навуковую калегію, якая мела на мэце "прыгатаваць вопытных і свядомых у беларускіх справах працаўнікоў дзеля кіраўніцтва ствараемымі беларускімі грамадскімі і адміністрацыйнымі ўстановамі" (Гоман, 1918. № 37).

Навучанне павінна было весціся на працягу 2 месяцаў. А тым, хто закончыў калегію, з дазволу Народнага Сакратарыяту выдаваліся дыпломы, якія давалі пэўныя правы і прывілеі пры паступленні на службу ва ўрадавыя ўстановы БНР.

Стварэнню нацыянальнай дзяржаўнасці абавязкова спадарожнічае нацыянальна-тэрытарыяльнае абасабленне. Абгрунтаванне дзяржаўных межаў — адзін з найважнейшых напрамкаў дзейнасці Народнага Сакратарыяту і Рады БНР.

Згодна з Трэцяй Устаўнай Граматай, Беларуская Народная Рэспубліка павінна *"абняць усе землі, дзе жыве і мае лічбовую перавагу беларускі народ, а ласне Магілёўшчыну, беларускія часці Меншчыны, Віленшчыны, Гародзеншчыны, Віцебшчыны, Смаленшчыны, Чарнігаўшчыны і сумежныя часткі суседніх губерній, заселеных беларусамі".*

(Працяг у наступным нумары.)

Мошенники задержаны с поличным

Излишняя доверчивость едва не подвела одного из жителей Гродно. Продав на здешнем авторынке иномарку трем незнакомцам из Могилевской области, он лишь на второй день решил проверить в банке подлинность вырученной валюты. Из 2100 долларов настоящими оказались только 600, а остальные купюры были подделаны самым примитивным способом — путем наклеивания на них дополнительных нолей.

Как стало известно корреспонденту БелТА, двух покупателей сотрудникам милиции удалось задержать в одном из районных центров Могилевщины — по месту жительства. Они доставлены в гродненский следственный изолятор. Третьего их сообщника ищут. Кстати, у арестованных во время домашнего обыска нашли еще несколько фальшивых долларовых купюр. Так что не исключено, что на их счету не одна подобная "операция".

По факту мошенничества возбуждено уголовное дело, ведется расследование.

Константин БОЛОТЕВИЧ.

Фотоэтюд

С днем рождения!..

Память

В строю — навечно

Тепловоз, на котором начертано "Евгений Володько", начал курсировать на участке железной дороги, пересекающем Беларусь с севера на юг. Приписана машина к Оршанскому локомотивному депо, коллектив которого и обратился в вышестоящие инстанции с предложением увековечить память ушедшего из жизни начальника Белорусской железной дороги, кавалера орденов Трудового Красного Знамени и "Знак почета".

Имя Евгения Володько присвоено также Оршанскому железнодорожному техникуму, где 40 лет назад учился будущий руководитель отрасли, а также электропоезду с минской "пропиской".

Ольга СИДОРОВИЧ.

Строительный рынок: весь спектр услуг

Крупнейшая Международная специализированная выставка "Стройэкспо-99" откроется 22 февраля в столичном выставочном павильоне по улице Янки Купалы. Она проводится Национальным выставочным центром "Белэкспо" при содействии министерств архитектуры и строительства, промышленности, жилищно-коммунального хозяйства.

Это уже вторая организованная выставочным центром экспозиция, на которой будет широко представлен белорусский строительный рынок. В ней примут участие около 200 фирм и предприятий. В их числе — ООО "Трайпл", ЗАО "Белгазэнерго", Гомельский литейный завод "Центролит", ЗАО "Белсталь". На отдельном коллективном стенде будут демонстрировать свои достижения предприятия Минстройархитектуры — ООО "Забудова", Молодечненский завод легких металлоконструкций, витебское предприятие "Керамика" и другие. Для них Национальным выставочным центром "Белэкспо" предоставлены площади по льготным тарифам.

Как сообщили корреспонденту БелТА организаторы экспозиции, "рейтинг популярности" тематических разделов уже определен: лидирующую позицию занимают строительные материалы, изделия и конструкции. В рамках выставки, которая продлится до 26 февраля, ее участникам будет предоставлена также возможность установить деловые контакты и заключить договоры о взаимовыгодном сотрудничестве накануне нового строительного сезона.

Тереза ХАЮТИНА.

Спорт

На "смотрины" — в Бельгию

Гандболистки сборной Беларуси отправились в Бельгию, где 18 и 20 февраля проведут с хозяйками два отборочных матча в рамках чемпионата мира. Вместе с главным тренером Леонидом Гуско находятся семь спортсменок, остальные наши легионерки присоединятся к ним в Германии, где намечен небольшой тренировочный сбор.

Напомним, что в нашу отборочную группу входит также команда Испании, которая уже дважды победила бельгиек — 32:18 и 32:11. А в финал мирового чемпионата попадает одна сборная.

Кубковые высоты белорусских "акробатов"

Успешно выступили на этапе Кубка мира в Австрии белорусские фристайлисты. И хотя победитель канадского этапа Дмитрий Дащинский на этот раз не поднялся на пьедестал почета, тем не менее, он занял почетное четвертое место, уступив именитым австрийцу Кристиану Риявцу, канадцу Ноколя Фонтену и американцу Бриту Свартли. Однако в общем зачете наш бронзовый призер Олимпиады в Нагано занимает вторую позицию. Так высоко белорусы еще не поднимались.

Очень сложную программу показал наш самый молодой лыжный акробат Алексей Гришин. Лишь маленькие погрешности помешали ему подняться выше пятого места. Менее удачно выступили Василий Воробьев (15-й) и Дмитрий Рак (25-й). Сейчас спортсмены готовятся к чемпионату мира, который стартует 9 марта в Швейцарии.

В отсутствие Ивана Иванкова победил Иван, но Павловский

На республиканских соревнованиях по спортивной гимнастике на призы газеты "Спортивная панорама" в отсутствие знаменитого белорусского чемпиона Ивана Иванкова почти все награды достались Ивану Павловскому из Гродно. За исключением упражнения на кольцах, на остальных снарядах он выступил ровно и получил довольно высокие оценки — от 9,2 до 9,4 балла.

Конкуренцию победителю смог составить только Дмитрий Касперович, у которого особенно удались упражнения на кольцах и перекладине — соответственно 9,55 и 9,7 балла.

"Теперь главным для нас является подготовка к чемпионату мира, который пройдет в Китае, — отметил главный тренер белорусской сборной Виктор Дойлидов. — Там будет идти борьба не только за награды, но и во многом определятся контуры нашей команды на Олимпиаде в Сиднее".

Вячеслав ДУТОВ.

20 БОГАТЕЙШИХ КЛУБОВ МИРА



Молдавских поэтов в Беларуси не забыли

Традиционным стало проведение в столичном Доме дружбы вечеров, посвященных белорусско-молдавским связям литераторов. На очередной из них собрались любители молдавской поэзии — белорусские писатели, переводчики, активисты общества "Беларусь — Молдова", журналисты.

Именно такие встречи помогают сегодня литераторам двух стран "не потерять" друг друга, расширить круг своих читателей. Ведь никакой экономический кризис не может заставить истинного творца отложить "перо" в сторону. И все же поэзия Богдана Истру, Георгия Мазилы, Иона Друце хорошо известна в Беларуси, что с удовлетворением отметил советник Посольства Молдовы в нашей стране Петр Тимуш.

На вечере звучало много стихов молдавских поэтов, а народный артист республики Геннадий Гарбук прочитал отрывок из народной молдавской баллады "Кодрану".

Галина ШАРАЕВА.

Выставка и ярмарка в одном "переплете"

Национальный выставочный центр "Белэкспо" стал на несколько дней местом паломничества полиграфистов, издателей и просто любителей книги. В одном и том же зале развернулись две крупные экспозиции, очень близкие по тематике — шестой Минской международной книжной ярмарки и Международной специализированной выставки "Combit-99", проходящей уже в пятый раз. Их торжественное открытие состоялось 16 февраля.

У обоих форумов есть общий организатор — Государственный комитет по печати.

Российские издательства вместе с белорусскими составили основную часть участников ярмарки. В целом же в этом списке несколько сотен фирм из ряда стран ближнего и дальнего зарубежья. Кстати, самим фактом проведения ярмарки наша страна может похвастаться даже перед своей соседкой. Ведь система подобных мероприятий тоже переживает тяжелые времена. Специалисты прогнозируют, что в нынешнем году во всех странах СНГ состоится не более 5-6 книжных форумов. Пожалуй, то же самое можно сказать и о таких выставках, как "Combit", посвященных современным технологиям в издательстве, полиграфии и рекламе. А в нынешнем году для участия в ней в Минск съехались представители крупнейших отечественных и мировых фирм-производителей в этой области.

Оксана ПИВОВАР.

Четверг, 18 февраля

БТ

06.30 Доброе утро, Беларусь!
07.00 Новости.
07.10 Доброе утро, Беларусь!
08.15 "Сегодня с вами..." Президент ООО "Предприятие Марко" Николай Мартынов.
08.40 Потребительская корзина. Социально-экономическая программа.
09.00 Новости.
09.15 Королевская охота.
09.45 Волейбол. Лига чемпионов. Женщины. "Амкодор" (Минск) — "Аугусто" (Калиш, Польша).
10.20 Мультиклуб.
11.00 Новости.
11.15 Телесериал "Проклятый уютный дом".
12.00 Наш край. "Из истории Минска".
12.25 "А музыка звучит..." Концерт ансамбля народной музыки "Фест" (г.Барановичи).
13.00 Новости.
13.15 Дневной сеанс. Х/ф "Секретный фарватер". 2-я с.
14.20 Телевизионный Дом кино. Заслуженный артист республики Виктор Манаев.
15.00 Новости.
15.10 Сериал для детей "Приключения Шерли Холмс" (Канада).
15.35 Видеокурс английского языка. Передача 38-я.
16.00 ТВ — школе. Музыка. 6-й класс. "Песня в творчестве белорусских композиторов".
16.30 Гости в дом.
17.00 Новости (с сурдопереводом).
17.15 Ток-шоу "Карамболь" с участием Елены Камбуровой.
17.45 Документальный экран. "Жили-были люди" (Белорусское телевидение).
18.10 Телесериал "Проклятый уютный дом".
19.00 Новости.
19.15 Политические диалоги.
19.40 Добрый вечер, Беларусь!
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.40 Событие.
22.00 "Крок-2". К 10-летию вывода советских войск из Афганистана.
22.45 Белорусский хит-парад.
22.50 Х/ф "Форт Саган" (Франция). 2-я с.
00.15 Криминальная хроника.
00.20 Новости.
00.30 Акколада. Музыкально-развлекательная программа.
00.55 Хоккей. Чемпионат ВЕХЛ. "Полимир" (Новополоцк) — "Неман" (Гродно). 3-й период. Передача из Витебска.

ОРТ

08.00, 11.00, 14.00, 17.00 Новости.
08.15 Сериал "Жестокий ангел".
09.15 Человек и закон.
09.55 Клуб путешественников.
10.40 Мультфильм "Мы такие мастера".
10.50 Домашняя библиотека.
11.15 Программа "Вместе".
14.15 Сериал "Новые приключения Синдбада".
14.45 Классная компания.
15.05 "Улица Сезам".
15.35 ...До шестнадцати и старше.
16.00 Сериал "Жестокий ангел".
17.15 Угадай мелодию.
17.45 Здесь и сейчас.
18.05 "В поисках утраченного".
18.45 Сериал "Вечный зов".
19.45 Спокойной ночи, малыши!
20.00 Время.
20.50 Комедия "Менялы".
22.25 Новость дня.
22.40 "Тихий дом".

РТР

06.00, 07.30, 08.30, 08.45 Доброе утро, Россия!
07.20 Торговый дом "Ле Монти".
08.15 Дежурная часть.
08.50 Товары — почтой.
09.00 Сериал "Санта-Барбара".
09.45 Музыка, музыка...
10.00, 16.00, 19.00, 23.20 Вести.
15.15 Мультфильм "Хочу бодаться".
15.25 Сериал "Первые поцелуи".
16.35 "Башня".
17.10 Видеофильм "Крестный путь Патриарха".
17.30 Сериал "Сезон охоты".
18.30 Двойной портрет.
19.40 Подробности.
19.55 "Два рояля".
20.40 Боевик "Кодекс молчания".
22.35 "Слушается дело".
23.55 Дежурная часть.
00.10 Товары — почтой.

КУЛЬТУРА

07.05, 11.30, 13.30, 19.30, 23.00 Новости культуры.
07.25 Д/ф "Эффект Кулешова-2".
08.15 "Ноу-хау".
08.30 Собор Рождества Иоанна Предтечи.
08.40 "Московские пенаты".
09.00, 15.00, 17.00 Новости.
09.05 Х/ф "Большая жизнь". 2-я с.
10.30 Произведения Ф.Мендельсона.
10.55 Парадоксы истории.
11.40 После новостей.
12.00 "БДТ: вчера, сегодня, завтра".
13.10 "2003".
13.15 Н.Метнер. Соната "Воспоминание".
13.45 "Маргит".
14.05 "Без визы".
14.20 Спектакль "Каинова печать".
15.05 Сериал "Арабелла возвращается, или Румбурак — король страны сказок".
15.35 "Лукоморье".
15.55 Микеланджело Буонарроти. "Я помыслами в вечность устремлен".
16.10 Живое дерево ремесел.
16.15 "Пушкин и судьбы русской культуры".
17.10 "Российский курьер".
17.50 Новое кино.
18.15 Д/ф "Ромео и Джульетта из Сараева".
19.15 Чудо-сказка.
19.50 Петербургские портреты.
20.15 "Время музыки".
20.45 После новостей...
21.05 Х/ф "Большая жизнь". 2-я с.
22.35 Телевернисаж.
22.40 Джазофрения.

НТВ

06.00 Сегодня утром.
08.10 Сериал "Любовь и тайны Сансет Бич".
09.00, 11.00, 13.00, 15.00, 18.00, 21.00 Сегодня.
09.15 Комедия "Берсальеры идут".
11.30 "Старый телевизор".
13.30 Сериал "Скорая помощь".
14.20 "Сегоднячко".
15.30 Сериал "Захватчики".
16.30 Впрок.
16.55 Сериал "Любовь и тайны Сансет Бич".
17.40 Криминал.
18.40 Герой дня.
19.00 Комедия "Агенты ФБР".
20.40 Профессия — репортер.
21.45 Сериал "Скорая помощь".
22.35 Сегоднячко.
23.15 Сегодня в полночь.

TV-6

05.55 День за днем.
07.45, 16.40, 22.30 Дорожный патруль.
08.00, 10.00, 12.00, 14.00, 17.00, 22.45 ТСН-6.
08.10, 22.55 Те Кто.
08.25, 17.25 Сериал "Третья планета от Солнца".
08.50, 17.50 Х/ф "Бегство к Афине".
10.10 Сериал "Зов убийцы".
11.00, 13.10, 14.10, 15.55 Телемагазин "Спасибо за покупку!".
11.15, 23.40 "Знак качества".
11.30 "Вы — очевидец".
12.10 Х/ф "Кошка на раскаленной крыше".
13.30 "Звезды о звездах". Лев Готовцев.
14.20 Сериал "Дикая Роза".
15.10 Мультсериал "Головокружительные приключения Билли и Теда".
15.25 Сериал "Старшеклассники Деграсси".
16.10, 23.10 ДИСК-канал.
19.00 "Новости дня".
19.30 "О.С.П.-студия".
20.25 Сериал "Lexx II".
21.25 "В мире людей".
22.00 "ОБОZZZ"-шоу.
23.55 "Эра Водолея" с Иваном Кононовым.

8-й канал

18.00 Программа Кеннета Копланда.
18.30 Х/ф "Неуловимые мстители".
19.45 Новости "К-видео".
20.15 Вечарніца.
20.30 Х/ф "Долгие версты войны". 3-я с.
21.45 Музпарад.
22.00 Х/ф "Формула любви".

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: (017) 229-28-71.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 229-29-04.
E-mail : nv@irex.minsk.by

Індэкс 63222.

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

Рэгістрацыйнае пасведчанне №246. Нумар газеты надрукаваны з дыяпазітываў у ПП "Мэджык". Адрас: г. Мінск, вул. В. Харужай, 13. Падпісаны ў друк у 21.00. Фармат А-2. Тыраж: суботні — 61050 экз., у другія дні — 55000 экз. Заказ №209